Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
_______________Н.У.Карчэўская
"_9_" _чэрвеня_ 2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_36_ / эвуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БЕЛАРУСКАЯ І СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА
## Раздзел ІІ. СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках),*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць;*
*напрамкаў спецыяльнасцей:*
*1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў),*
*1-16 01 06-11 Духавыя інструменты (народныя),*
*1-16-01 10-02 Спевы (народныя),*
*1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае)*

2018

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі першай па спецыяльнасцях універсітэта і вучэбных планаў па спецыяльнасцях: 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках), 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках), 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках), 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць; напрамкаў спецыяльнасцей: 1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў), 1-16 01 06-11 Духавыя інструменты (народныя), 1-16-01 10-02 Спевы (народныя), 1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (па напрмаках), 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае)

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Н. А. Булацкая*, прафесар кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

*С.М.Тычына*, дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*А.А. Жэлуновіч*, загадчык кафедры рускай мовы як замежнай установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

*Н.В. Заяц,* дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 9 ад 15.05.2017);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 1 ад 19.10.2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская і сусветная літаратура» складаецца з двух раздзелаў: «Беларуская літаратура» і «Сусветная літаратура». Дадзеная праграма прызначана для вывучэння раздзела «Сусветная літаратура».

Аўтары вучэбнай праграмы ўлічвалі пераемнасць літаратурнай адукацыі, рэальныя магчымасці адукацыйнага працэсу і ўзаемадзеянне з інтэграваным модулем «Гісторыя» і вучэбнымі дысцыплінамі «Філасофія» (дапамагаюць уявіць гістарычныя абставіны, думкі, філасофскія погляды пісьменнікаў), «Псіхалогія» (садзейнічае разуменню характараў герояў, даследаванню праблемы чалавека і грамадства), «Культуралогія» (менавіта літаратурныя творы адлюстроўваюць стан і праблемы развіцця культуры і мастацтва). У праграме ўлічана нацыянальная рэцэпцыя, суаднесенасць з беларускай літаратурай, прадстаўлены асаблівасці ўзаемадзеяння розных відаў мастацтва, у тым ліку літаратуры і музыкі, літаратуры і жывапісу.

Сусветны літаратурны працэс разглядаецца ў праграме паслядоўна, ад старажытных часоў да сучаснасці. Для літаратурнага аналізу пададзены найбольш значныя і характэрныя для пэўных перыядаў творы. Вывучэнне студэнтамі сусветнай літаратуры садзейнічае развіццю іх інтэлекту, духоўнаму ўзбагачэнню асобы, дапамагае выпрацаваць маральныя крытэрыі, актыўную жыццёвую пазіцыю, выхаваць эстэтычны густ і высокую культуру. Менавіта гэта і вызначае *мэту вучэбнай дысцыпліны* – раскрыць адметнасць і шматстайнасць сусветнага літаратурнага працэсу, даць уяўленне пра асноўныя этапы яго развіцця, пра змены мастацка-светапоглядных сістэм.

У адпаведнасці з мэтай вызначаюцца наступныя *задачы*:

– даць студэнтам веды аб змесце, заканамернасцях сусветнага літаратурнага працэсу;
– пазнаёміць з літаратурнымі здабыткамі краін Заходняй і Усходняй Еўропы і Амерыкі;
– сфарміраваць у студэнтаў сістэмнае мысленне і ўспрыманне літаратурнага твора як з’явы мастацкай культуры;
– садзейнічаць развіццю ў студэнтаў моўнай культуры;
– стымуляваць прафесійны падыход пры засваенні матэрыялу;
– навучыць аналізаваць літаратурны твор;
– выхоўваць рознабакова развітую асобу, якая мае эстэтычны густ і можа арыентавацца ў свеце мастацкіх з’яў;
– паказаць сувязі літаратуры з філасофіяй, гісторыяй, усімі галінамі грамадска-інтэлектуальнай, творчай дзейнасці чалавека.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– месца і ролю мастацкай літаратуры ў культуралагічным кантэксце;
– спецыфіку мастацкай літаратуры як формы спасціжэння свету;
– сувязі і ўзаемаўплывы літаратуры з іншымі відамі мастацтва;
– агульныя заканамернасці, тэндэнцыі развіцця, значэнне сусветнай літаратуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– мастацка-светапоглядныя сістэмы, іх змест, існаванне на працягу часу;
– творчасць яркіх прадстаўнікоў кожнай з мастацкіх эпох;

*умець:*

– характарызаваць літаратурную эпоху і асноўныя этапы яе развіцця;
– вызначаць спецыфіку нацыянальнага літаратурнага працэсу;
– успрымаць літаратурны твор ва ўзаемасувязі гісторыі і сучаснасці;
– самастойна аналізаваць мастацкі твор і творчасць пісьменніка;
– выкарыстоўваць набытыя веды ў прафесійнай дзейнасці;
– весці дыялог па дыскусійных пытаннях сусветнай літаратуры;

*валодаць:*

– метадамі культурна-гістарычнага аналізу літаратурнага працэсу;
– асноўнымі паняццямі і катэгорыямі мастацкай інтэрпрэтацыі твора.

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны рэкамендавана выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі навучання і прынцыпы параўнальна-гістарычнага, культурна-гістарычнага, структурна-семантычнага, тыпалагічнага метадаў.

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі ведаў у галіне беларускага літаратуразнаўства і фарміраванні ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных філалагічных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;
– праектнае навучанне;
– модулевае навучанне;
– праблемнае навучанне;
– метад актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;
– тлумачальна-ілюстратыўныя тэхналогіі навучання;
– метад уключанага назірання.

Зместам вучэбнай дысцыпліны прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый, адпаведна з адукацыйнымі стандартамі вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасцях універсітэта:

**акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-9. Умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі.

АК-14. Аналізаваць і разумець светапоглядныя, сацыяльныя і асобасна-значымыя філасофскія праблемы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

АК-19. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць рашэнне задач, інавацыйна-метадычнай і навуковай дзейнасці.

АК-20. Валодаць сродкамі самастойнага, правільнага выкарыстання метадаў фізічнага выхавання і ўмацавання здароўя для забеспячэння паўнацэннай сацыяльнай і прафесійнай дзейнасці.

**сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-4. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і сусвету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

САК-8. Праяўляць ініцыятыву, у т.л. у нестандартных сітуацыях.

САК-9. Удасканальваць і развіваць свой інтэлектуальны і агульны ўзровень, маральна і фізічна ўдасканальваць сваю асобу.

САК-10. Фарміраваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю.

**прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-1. Далучаць розныя групы насельніцтва і асобных індывідаў да працэсу стварэння, засваення, зберажэння і распаўсюджання каштоўнасцей культуры.

ПК-2. Выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры.

ПК-8. Рэгуляваць адносіны і ўзаемадзеянні ў педагагічным працэсе.

ПК-9. Ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сферы культуры і мастацтваў.

ПК-10. Прагназаваць, планаваць і арганізоўваць інавацыйна-метадычную і мастацка-творчую дзейнасць у сферы культуры і мастацтваў.

ПК-11. Працаваць з вучэбнымі планамі і праграмамі, метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі працэсу навучання і выхавання.

ПК-13. Улічваць псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў і практыкаваць індывідуальны падыход да вырашэння мэт і задач навучання і выхавання.

ПК-14. Карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі для азнаямлення з нарматыўнай базай адукацыі і інавацыямі ў навучанні.

ПК-15. Удасканальваць сваё педагагічнае майстэрства.

ПК-17. Удасканальваць сваё педагагічнае майстэрства.

ПК-18. Арганізоўваць працу навукова-метадычных канферэнцый па праблемах вывучэння і захавання народна-духавых інструментальных традыцый.

ПК-19. Ладзіць арганізацыю і правядзенне маштабных фестываляў на адкрытай прасторы, прысвечаных актуальным пытанням сучаснага грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-21. Вызначаць актуальныя праблемы ў галіне рэжысуры свят і прапаноўваць шляхі іх вырашэння.

Пк-22. Распрацоўваць анкеты для збору звестак па праблемах развіцця і захавання народнай творчасці, запатрабаванасці ў соцыуме свят разнастайных накірункаў.

ПК-24. Ажыццяўляць навукова-эксперыментальную работу ў галіне рэжысуры свят.

ПК-26. Карыстацца сучаснымі сродкамі тэлекамунікацый і глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі.

ПК-27. Вывучаць, абагульняць практычны і тэарэтычны вопыт айчыннага і замежнага харэаграфічнага мастацтва.

ПК-28. Карыстацца сучаснымі інфармацыйнымі рэсурсамі.

ПК-29. Распрацоўваць вучэбна-метадычныя матэрыялы, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, ажыццяўляць метадычныя распрацоўкі па адпаведных вучэбных дысцыплінах.

ПК-31. Аналізаваць сучасны стан, перспектывы і кірункі захавання і развіцця народна-песеннай творчасці.

ПК-32. Здзяйсняць нагляд за ўмовамі бытавання розных відаў і жанраў песеннага фальклору ў мэтах яго захавання і пераемнасці.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Беларуская і сусветная літаратура. Раздзел II. Сусветная літаратура» для спецыяльнасцей 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках), 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках) і напрамкаў спецыяльнасцей 1-15 02 01-07 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (рэстаўрацыя вырабаў), 1-18 01 01-03 Народная творчасць (тэатральная), 1-18 01 01-04 Народная творчасць (народныя рамёствы), 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор) усяго адведзена 134 гадзіны, з якіх 52 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 26 г. – лекцыі, 26 г. – семінарскія заняткі. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен. Для спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках), напрамкаў спецыяльнасцей 1-16 01 06-11 Духавыя інструменты (народныя), 1-16 01 10-02 Спевы (народныя), 1-18 01 01-01 Народная творчасць (харавая музыка), 1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка) усяго адведзена 148 гадзін, з якіх 60 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 32 г. – лекцыі, 28 г. – семінарскія заняткі. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен. Для спецыяльнасцей 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках), 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць, 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае) усяго адведзена 116 гадзін, з якіх 60 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 32 г. – лекцыі, 28 г. – семінарскія заняткі. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел I. Літаратура Заходняй Еўропы і Амерыкі

### *Тэма 1. Уводзіны*

Спецыфіка мастацкай формы пазнання рэчаіснасці. Месца літаратуры ў шэрагу відаў мастацтваў. Літаратура як інтэлектуальны від мастацтва. Сэнсавая насычанасць, кампактнасць і аператыўнасць слоўнай выяўленчасці. Сувязь літаратуры з грамадска-палітычнымі рухамі і плынямі філасофскай думкі. Адлюстраванне ў літаратуры развіцця чалавечай асобы, яе самапазнання і самавыяўлення. Паняцце аб інтэрпрэтацыі мастацкага твора. Роля літаратурнай крытыкі ў ацэнцы новых твораў, пераглядзе ацэнак мінулых гадоў. Міжнародныя культурна-мастацкія сувязі як умова і крыніца ўзбагачэння нацыянальных літаратур. Сусветная літаратура ў новым інфармацыйным асяроддзі.

Еўрапейская лінія грамадска-эканамічнага, палітычнага, сацыяльнага развіцця як магістральная лінія руху чалавечай цывілізацыі. Яе адбітак у гісторыі літаратуры. Нацыянальная і рэгіянальная спецыфіка, моманты агульнасці (паўторнасці) у літаратурах розных краін. Іх збліжэнне на глебе культурна-гістарычнага развіцця.

Сусветны літаратурны працэс. Яго гісторыя як дынамічная сістэма ідэйных і мастацкіх каштоўнасцей. Стадыі развіцця літаратурнага працэсу ў Заходняй і Усходняй Еўропе і ў Амерыцы. Перыядызацыя.

### *Тэма 2. Антычная літаратура*

Антычная літаратура як пачатковы этап развіцця еўрапейскага прыгожага пісьменства. Міфалогія і яе роля ў гісторыі антычнай літаратуры. Перыядызацыя старажытнагрэчаскай і старажытнарымскай літаратур. Зараджэнне і станаўленне ў старагрэчаскай літаратуры трох літаратурных родаў (эпас, лірыка, драма). Распрацоўка літаратурных жанраў.

«Іліяда» і «Адысея» Гамера. «Гамераўскае пытанне». Росквіт грэчаскай лірыкі ў VII–VI стст. да н.э. і яе народныя вытокі. Творы Тыртэя, Анакрэонта, Сапфо, Эзопа. Нараджэнне і развіццё старагрэчаскай драмы і тэатра. Трагедыя Эсхіла «Прыкуты Праметэй». Вечны вобраз Праметэя ў сусветнай літаратуры. Трагедыі Сафокла і Еўрыпіда. Камедыі Арыстафана і Менандра.

Нараджэнне мастацкай прозы на аснове гістарычных (Герадот, Фукідыд), філасофскіх (Платон, Арыстоцель) твораў і ўзораў красамоўства (Дэмасфен). З'яўленне жанру рамана (Лонг «Дафніс і Хлоя»).

Характэрныя рысы старажытнай рымскай літаратуры. Сацыяльныя праблемы ў творах Плаўта. Тэрэнцый як прадстаўнік бытавой камедыі. Паэма Вергілія «Энеіда». Травестацыя твора ў беларускай паэме «Энеіда навыварат» В. Равінскага. Паэзія Старажытнага Рыма.

Авантурна-казачны раман (Апулей «Метамарфозы, альбо Залаты асёл»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэцэпцыя антычных сюжэтаў, матываў, вобразаў у мастацтве наступных эпох.

### *Тэма 3. Літаратура эпохі Сярэднявечча і эпохі Адраджэння*

Перыядызацыя. Уплыў хрысціянства на развіццё еўрапейскага мастацтва. Асноўныя жанры царкоўна-рэлігійнай літаратуры. Геданізм, сатыра ў паэзіі вагантаў.

Уздзеянне фальклорных і хрысціянскіх традыцый на свецкую літаратуру. Скандынаўскія сагі. Ірландская «Сага пра Кухуліна». Народны эпас эпохі феадалізму («Песня пра Раланда», «Песня пра Сіда», «Песня пра Нібелунгаў»).

Рыцарская літаратура. Тэматыка рыцарскай паэзіі. Рыцарскі раман. «Раман пра Трыстана і Ізольду». Пераклады рамана на беларускую мову, з’яўленне на беларускіх землях XVI ст. «Аповесці пра Трышчана».

Дыдактычны і сатырычны характар гарадской літаратуры.

Адкрыццё антычнай спадчыны, зварот да антрапацэнтрызму і гуманізму як галоўныя рысы эпохі Адраджэння. Творчасць Дантэ Аліг’еры. Паэма «Боская камедыя». «Дэкамерон» Д. Бакачыа. Раман Ф. Рабле «Гарганцюа і Пантагруэль».

Творчы шлях У. Шэкспіра. «Рамэа і Джульета», «Утаймаванне свавольніцы». Цікавасць Шэкспіра да трагічных канфліктаў і герояў, адлюстраванне крызісу гуманістычнай канцэпцыі ў творах «Гамлет», «Атэла», «Кароль Лір», «Макбет». Зварот да фантастыкі ў трагікамедыях («Бура»). Пастаноўкі п’ес Шэкспіра на беларускай сцэне.

Раман М. Сервантэса «Хітрамудры ідальга Дон Кіхот Ламанчаскі». Вечныя вобразы ў літаратуры эпохі Адраджэння.

### *Тэма 4. Літаратура XVII ст. і эпохі Асветніцтва*

Крызіс ідэалаў Адраджэння і развіццё асноўных напрамкаў XVII ст.: рэнесансны рэалізм (Лопэ дэ Вега), барока (П. Кальдэрон), класіцызм (П. Карнэль, Ж. Расін). Класіцызм як мастацка-эстэтычная сістэма. Змаганне пачуццяў і абавязку, пачуццяў і розуму ў трагедыях П. Карнэля («Сід»), Ж. Расіна («Федра»). Выкрыццё чалавечых заганаў у камедыях Ж.Б. Мальера «Тарцюф», «Скупы», «Дон Жуан». Традыцыі класіцызму і наватарства ў творах Мальера. Творчае выкарыстанне і пастаноўкі п’ес Мальера ў Беларусі.

Уплыў гуманістычных ідэй Адраджэння і дасягненняў кірункаў Рэнесансу на літаратуру эпохі Асветніцтва. Антыфеадальная накіраванасць асветніцкай літаратуры. Ідэя выхавання чалавека. Культ розуму і навукі. Цесная сувязь мастацкай літаратуры з філасофіяй і эстэтыкай. Галоўныя мастацкія сістэмы XVIII ст.: асветніцкі класіцызм, асветніцкі рэалізм, сентыменталізм.

Асаблівасці англійскай асветніцкай літаратуры. «Рабінзон Круза» Д. Дэфо і «Падарожжы Гулівера» Д. Свіфта як раманы прыгод і вандровак. Самабытнасць паэзіі Р. Бёрнса.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Філасофскія і эстэтычныя погляды французскіх асветнікаў, грамадска-палітычнае значэнне іх дзейнасці (Вальтэр, Д. Дзідро, Ж. Ж. Русо). Камедыі П. Бамаршэ.

Цікавасць да духоўнага жыцця чалавека, філасофскае асэнсаванне свету ў творчасці нямецкіх асветнікаў (Г. Э. Лесінг, Ф. Шылер, Ё. В. Гётэ). Рысы сентыменталізму ў «Пакутах маладога Вертэра» Гётэ. Трагедыя «Фаўст».

### *Тэма 5. Літаратура ХІХ ст.*

Гістарычныя, сацыяльна-палітычныя, эстэтычныя передумовы развіцця літаратуры ХІХ ст. Вядучыя мастацкія напрамкі ХІХ ст.

Фарміраванне рамантызму як мастацкага метаду. Асноўныя рысы рамантычнай эстэтыкі. Узаемадзеянне літаратуры, музыкі і жывапісу.

Асаблівасці нямецкага рамантызму. Творчасць Э.Т.А. Гофмана. Уплыў гофманаўскіх традыцый на беларускую літаратуру. Пераклады твораў нямецкіх рамантыкаў на беларускую мову. Лірыка Г. Гейнэ.

Характэрныя рысы французскага рамантызму. Творчасць В. Гюго. Распрацоўка жанру гістарычнага рамана («Сабор Парыжскай Божай Маці», «Дзевяноста трэці год»), увага да сацыяльных праблем («Чалавек, які смяецца», «Адрынутыя»).

Нацыянальная адметнасць англійскага рамантызму. «Паломніцтва Чайльд-Гарольда», усходнія паэмы Д. Г. Байрана. Спалучэнне рамантызму і рэалізму ў рамане ў вершах «Дон Жуан». Байранічны тып героя, яго двайнікі ў іншых літаратурах. Гістарычны раман В. Скота.

Рамантызм у амерыканскай літаратуры. Псіхалагізм навел жахаў Э. По. Э. По – роданачальнік дэтэктыўнай літаратуры. Жанр гістарычнага рамана ў творчасці Д. Ф. Купера.

Рэалізм як метад і дамінуючы мастацкі напрамак у 1830–1870-х гг. Характэрныя рысы рэалістычнага твора. Узаемаадносіны чалавека і грамадства як вядучая праблема літаратуры рэалізму. Праблема маральнай дэградацыі чалавека ў творах пісьменнікаў.

Адлюстраванне ў творчасці А. дэ Бальзака, Ч. Дзікенса, У. Тэкерэя залежнасці фарміравання асобы ад жыццёвых абставін і сацыяльнага асяроддзя. «Чалавечая камедыя» А. дэ Бальзака. Пошук асновы заганных сацыяльных з'яў, тэма грошай і іх улады над людзьмі, уплыў грамадства на станаўленне чалавека як асобы («Яўгенія Грандэ», «Габсек», «Бацька Гарыа», «Страчаныя ілюзіі», «Шчыгрынавая скура»). Спалучэнне рэалістычнага і рамантычнага ў творах. Уплыў рамантычных і асветніцкіх ідэй на творчасць Стэндаля. Гістарычная дасканаласць, псіхалагічнае майстэрства ў раманах «Чырвонае і чорнае», «Пармскі манастыр». Уздзеянне творчасці А. дэ Бальзака і Стэндаля на літаратуру ХХ ст. Творчасць Г. Флабэра. Канцэпцыя бясстраснага мастацтва, «аб'ектыўны» метад Г. Флабэра.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

### *Тэма 6. Заходнееўрапейская і амерыканская літаратура канца XIX – пачатку XX ст.*

Грамадска-палітычныя падзеі, супярэчнасці ў гістарычных, светапоглядных і эстэтычных сферах канца XIX – пачатку XX ст. Складанасць літаратурнага працэсу. Узнікненне ў мастацтве мноства плыняў і напрамкаў, іх узаемадзеянне. Развіццё рэалізму на мяжы стагоддзяў у французскай, нямецкай, англійскай і амерыканскай літаратурах. Крытыка заганаў грамадства, арыентацыя на дэмакратычныя, гуманістычныя ідэалы, з'яўленне станоўчага героя часу (Б. Шоу, Р. Ралан, Д. Лондан).

Натуралізм як мастацкі кірунак і метад. Натуралізм і рэалізм. Уплыў натуралізму на літаратуру XX ст. Творчасць Э. Заля.

Дэкадэнцтва і мадэрнізм у літаратуры. Ідэі эстэтызму і творчасць О. Уайльда. Сімвалізм паэзіі А. Рэмбо і П. Верлена. Рысы імпрэсіянізму ў лірыцы П. Верлена. Паэзія Г. Апалінэра.

Тэмы, праблемы навел і раманаў Гі дэ Мапасана. Філасофскі і інтэлектуальны раман Т. Мана («Чароўная гара», «Доктар Фаўстус»). Навелы Т. Мана. Творчасць Д. Голсуарсі.

Англійская драматургія на мяжы стагоддзяў. Развіццё ібсенаўскіх традыцый і наватарства ў творчасці Б. Шоу. Асаблівасці драмы-дыскусіі, яе праблематыка («Прафесія місіс Уорэн», «Пігмаліён» і інш.).

«Прыгоды Гекльберы Фіна», «Прынц і жабрак» М. Твена. Тэма амерыканскай мары і трагізм існавання чалавека ў творчасці Д. Лондана (паўночныя апавяданні, «Марцін Ідэн»), Д. Стэйнбека («Зіма трывогі нашай», «Гронкі гневу») і Т. Драйзера («Амерыканская трагедыя», «Сястра Керы»). Бальзакаўскія рэалістычныя прынцыпы і традыцыі натуралізму ў творчасці Т. Драйзера. Сацыяльна-ўтапічны раман Г. Уэлса, яго роля ў развіцці фантастыкі.

Неарамантызм. Неарамантычны герой Р. Стывенсана, А. Конан-Дойля. Тэматыка і праблематыка творчасці Д. Р. Кіплінга.

### *Тэма 7. Агульная характарыстыка літаратуры XX – пачатку XXI ст.*

Грамадска-гістарычныя ўмовы. Ускладненасць сусветнага мастацкага працэсу. Рэалізм, мадэрнізм, авангардызм, экзістэнцыялізм, постмадэрнізм як важнейшыя з'явы ў літаратуры XX ст. Іх узаемадзеянне і ўзаемаўзбагачэнне. Погляды на чалавека і свет, на магчымасці далейшага развіцця чалавечай цывілізацыі, грамадства.

Тэма і праблема вайны, асэнсаванне прычын яе ўзнікнення і вынікаў у рэалістычнай літаратуры (Э. М. Рэмарк, Э. Хемінгуэй, Г. Бёль і інш.). Гуманістычная канцэпцыя асобы ў творах XX ст. (Р. Ралан, Э. Хемінгуэй, Г. Грын). Асвятленне пытанняў адказнасці чалавека за сябе і за іншых (А. Сент-Экзюперы, Б. Брэхт). Суб'ектыўнасць, эксперымент і наватарства, асаблівасці творчага метаду пісьменнікаў (М. Пруст, У. Фолкнер, Д. Джойс, В. Вулф, С. Бекет, Э. Іанеска і інш.). Міфалагічныя вытокі сюжэтаў і вобразаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у творах Д. Джойса, Т. Мана, А. Камю, Х. Л. Борхеса і інш. Сінтэз розных мастацкіх напрамкаў у творчасці пісьменнікаў.

Інтэлектуальная драма XX ст. (Б. Шоу, Б. Брэхт, Ж. Ануй).

Дэтэктыў, навуковая фантастыка і фэнтэзі (Ж. Сімянон, А. Крысці, Р. Брэдберы, Д.Р.Р. Толкін, Р. Говард і інш.).

Замежная літаратура XX ст. у беларускіх перакладах.

### *Тэма 8. Англійская літаратура XX ст.*

Мастацкі прыём «плынь свядомасці». Цікавасць да глыбінь псіхалогіі ў мадэрнісцкай літаратуры («Уліс» Д. Джойса, «Міс Дэлоўэй» В. Вулф і інш.).

Экзістэнцыялізм у англійскай літаратуры XX ст. (творчасць А. Мёрдак, У. Голдынга). Даследаванне дэструктыўнасці і агрэсіі чалавека ў рамане «Уладар мух» У. Голдынга.

Антыкаланіяльны раман Г. Грына («Ціхі амерыканец»). Духоўны свет чалавека, пошукі сапраўднага ва ўмовах жорсткай рэчаіснасці («Камедыянты», «Ганаровы консул»).

Антыўтопія ў англійскай літаратуры (О. Хакслі, Д. Оруэл, Э. Бёрджэс).

Паэтыка постмадэрнізму ў творчасці Д. Фаўлза («Калекцыянер», «Жанчына французскага лейтэнанта»).

### *Тэма 9. Французская літаратура XX ст.*

Рэалізм у французскай літаратуры XX ст. Адлюстраванне жахаў вайны ў рамане А. Барбюса «Агонь». Інтэлектуальная проза А. Сент-Экзюперы: усведамленне сувязі паміж людзьмі і адказнасці за іншых («Планета людзей»). Дзіцячы погляд на свет дарослых, сатыра ў аповесці-казцы «Маленькі прынц».

«Новы раман» 40–60-х гг. XX ст. («Залатыя плады» Н. Сарот).

Творчасць Ф. Саган.

Экзістэнцыяльныя праблемы ў творчасці Ж. П. Сартра. Зборнік навел «Мур». Творчасць А. Камю. Эсэ «Міф пра Сізіфа», філасофская аповесць «Чужаніца», раман-прытча «Чума». Экзістэнцыяльная інтэлектуальная драма Ж. Ануя. «Антыгона», «Жаваранак».

«Тэатр абсурду» («Лысая спявачка» Э. Іанеска, «У чаканні Гадо» С. Бекета).

### *Тэма 10. Нямецкая літаратура XX ст.*

Натуралізм і экспрэсіянізм у нямецкай літаратуры (Г. Гаўптман, Б. Брэхт, Э. М. Рэмарк і інш.).

Творчасць Ф. Кафкі (раманы «Замак», «Працэс», навела «Ператварэнне»): рысы экспрэсіянізму і «магічнага рэалізму»; ірацыяналізм, песімізм, алегарызм творчасці. Уплыў Ф. Кафкі на сусветную літаратуру.

Э. М. Рэмарк як пісьменнік «страчанага пакалення». Раманы «На Заходнім фронце без перамен», «Тры таварышы».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Антыфашысцкая і антываенная нямецкая літаратура (Э. М. Рэмарк, Г. Бёль, А. Зегерс і інш.). Гуманістычны пафас, грамадска-маральная праблематыка раманаў Г. Бёля. Гратэскна-сатырычны раман Г. Граса «Бляшаны барабан».

«Тэорыя эпічнага тэатра» Б. Брэхта. П'есы «Матуля Кураж і яе дзеці», «Жыццё Галілея».

Унутранае жыццё чалавека, праблемы асобы ў творчасці Г. Гесэ («Стэпавы воўк», «Гульня ў бісер»).

Рысы постмадэрнісцкай паэтыкі ў рамане П. Зюскінда «Парфума».

### *Тэма 11. Амерыканская літаратура XX ст. (літаратура ЗША і лацінаамерыканская літаратура)*

Рэалізм у літаратуры ЗША (Т. Драйзер, Д. Стэйнбек, Э. Хемінгуэй і інш.). Э. Хемінгуэй і яго раман «Па кім звоніць звон». Тэма «страчанага пакалення» ў творчасці Э. Хемінгуэя («Бывай, зброя!»). Праблематыка, сімволіка, трагедыя чалавечага існавання ў аповесці «Стары і мора».

Погляд маладога пакалення на жыццё, выяўленне сапраўднага і фальшывага, «паказнога» ў рамане Д. Д. Сэлінджэра «Над безданню ў жыце».

Сімволіка, праблемы ўзаемаадносін асобы і грамадства, навязванне стандартаў у рамане К. Кізі «Над гняздом зязюлі».

Асаблівасці лацінаамерыканскай літаратуры. Уплыў еўрапейскіх традыцый. «Магічны рэалізм» у творчасці Г. Г. Маркеса («Сто гадоў адзіноты»). Постмадэрнізм у лацінаамерыканскай літаратуры (Х. Л. Борхес, А. Б. Касарэс, Х. Картасар).

Р. Бах і яго «Чайка па імені Джонатан Лівінгстон».

### *Тэма 12. Сучасная літаратура Заходняй Еўропы і Амерыкі*

Сучасная літаратура Заходняй Еўропы і Амерыкі. Феномен масавай літаратуры. Спалучэнне рыс інтэлектуальнай і масавай літаратуры ў творах постмадэрністаў (У. Эка). Развіццё дэтэктыўнай, фантастычнай, фэнтэзійнай, эратычнай літаратуры, літаратуры жахаў, графічнай літаратуры (Ж. Сімянон, Р. Брэдберы, Р. Шэклі, Р. Хайнлайн, С. Кінг і інш.). Распаўсюджванне ў еўрапейскіх і амерыканскіх краінах японскай літаратуры (К. Абэ, К. Оэ, Х. Муракамі і інш.). Уплыў светапогляднай сістэмы ўсходніх культур на фарміраванне сучаснага агульнага светаўспрымання.

Літаратура і новыя інфармацыйныя тэхналогіі.

## Раздзел II. Славянскія літаратуры

### *Тэма 13. Руская літаратура XI–XIX стст.*

